Маціеўскі, М. Такія сціплыя героі / М. Маціеўскі // Чырвоны прамень (Чашнікі). — 1994. — 22 лют. — С. 1.

ТАКІЯ СЦІПЛЫЯ ГЕРОІ

Ёсць у вядомай песні словы: «Фронтовики, оденьте ордена». Гэта пра ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны спяваецца. Але іх у поўнай меры можна аднесці і да воінаў-афганцаў, большасць якіх таксама мае высокія баявыя узнагароды, праявіла на далёкай афганскай зямлі мужнасць і гераізм.

З Валерыем Ганчаровым мы сустракаліся не аднойчы. Сціплы, не вельмі разгаворлівы – ну, калі не ведаеш, ні за што б не сказаў, што ён мужна вёў у бой у горных цяснінах сваіх таварышаў, што неаднойчы выратоўваў іх сваёй разважлівасцю, камандзірскай кемлівасцю ад немінуемай смерці. На выглляд хлопец, як хлопец, з якімі кожны дзень сустракаемся па некалькі разоў. Але ж Афганістан быў. І мажліва (пераконваўсябе не адзін раз), героямі становяцца вось такія сціплыя, на першы погляд, непрыкметныя хлопцы, як Валерый. Героі – пераважна людзі сарамлівыя.

Дарога вяла па цясніне. «Пакжэр», то выбягаючы на шырокую даліну, то прыціскалася да скал, пятляючы па-над рэчкай. Самаходныя артылерыйскія ўстаноўкі ішлі на падтрымку разведпадраздзялення. Тут, у цясніне, пазіцыі душманаў, быў цэнтр падрыхтоўкі да дыверсій, зверстваў над мірнымі жыхарамі. Па дзеяннях было відаць, што «духаў» трэніравалі замежныя наёмнікі.

Нечакана адну з самаходак пацягнула ўбок і тая завісла над абрывам. Паспрабавалі ўзяць на буксір – не атрымалася. Што рабіць? Губляецца час, і ды і мішэнню для банды непажадана быць.

– Ёсць ідэя, – прапанаваў сяржант Ганчароў. – Пачакайце.

Разам з механікам-вадзіцелем яму падалося зберагчы машыну. Толькі давялося выкупацца ў халоднай вясновай вадзе, зрабіўшы насцілы, з рызыкай, акунаючыся на самаходцы ў палынню...

Са службовай характарыстыкі:

Сяржант В. В. Ганчароў карыстаецца аўтарытэтам сярод таварышаў па службе, паказвае прыклад у выхаванні воінаў. За ўмелыя дзеянні і мужнасць пры выкананні баявых заданняў узнагароджаны медалем «За адвагу» і Ганаровай граматай ЦК ВЛКСМ.

...На дапамогу афганскім таварышам прыспешваюць па параненай дарозе самаходкі. Тры з іх па тэхнічных няспраўнасцях адсталі. Непаладкі выправілі хутка, але дывізіён ужо быў на значнай адлегласці. З невялікага плато бачыліся кішлак, сады. І раптам ціхі ранак парушылі аўтаматныя і кулямётныя чэргі. Стралялі адусюль, здавалася, што ўся цясніна пасылае кулі. Нечакана адна з машын падарвалася на міне. Валерый Ганчароў, з'яўляючыся старшым групы, аддае загад, заняць кругавую абарону, а групе з чатырох чалавек узяцца за рамонт. Душманам, нягледзячы на актыўныя дзеянні, не ўдалося сціснуць кальцо. То кулямёт аднаго не даваў зайсці ім у тыл, то другога.Нашы воіны стралялі трапна. А тым часам самаходка была на хаду. Ганчароў падае каманду: «Па машынах» і група імкліва рванула ўперад.

Ёсць у яшчэ адной армейскай песні цудоўныя словы: «Салдат, заўжды салдат». Гэта як быццам і пра Валерыя Ганчарова спяваецца. Не страціў ён вайсковай выпраўкі, і сёння стройны,

падцягнуты. Не хапае толькі формы салдацкай. Валерый захоўвае яе ў шафе, іншы раз адкрывае, паглядзіць – на кіцелі зззяюць дзве баявыя ўзнагароды, знак «Выдатнік Савецкай Арміі».

– Армія – сапраўдная школа для мужчын, – дзеліцца думкамі былы салдат. – Мяне яна прывучыла да дысцыплінаванасці, парадку.

М. Маціеўскі